# СКАЗ

**186.** Знайдзіце сярод прапанаваных спалучэнняў слоў сказ. Па якіх прыметах вы вызначылі, што гэта сказ? Выпішыце сказ.

Таня, спячы, торт, для, свой, матуля.

Таня спякла торт для...

Таня спякла торт для сваёй матулі.



Сказ выражае закончаную думку.

Першае слова ў сказе пішацца з вялікай літары. У канцы сказа ставіцца кропка (.), пытальнік (?) або клічнік (!).

**187.** Выразна прачытайце верш.

— Што, сябры, для жыта трэба?
— Ну, вядома, трэба глеба.



Правообладатель Национальный институт образования

— А для птушкі?
— Вышыня.
— А для казкі?
— Цішыня.
— Ну, а што для весялосці?
— Каб часцей бывалі госці!

*М. Гелер.*

Знайдзіце і прачытайце сказы-пытанні. Які знак стаіць у канцы гэтых сказаў?

Знайдзіце і прачытайце сказы-адказы. Які знак стаіць у канцы гэтых сказаў?

Знайдзіце сказ, які трэба чытаць з моцным пачуццём. Які знак стаіць у канцы гэтага сказа?

У якіх сказах больш за ўсё слоў? У якіх сказах менш за ўсё слоў?

**188.** Прачытайце. Колькі тут сказаў? Спішыце, правільна афарміце сказы на пісьме.

Цётка Паўліка жыве ў вёсцы летам хлопчык ездзіць да яе ў госці там у Паўліка ёсць сябры ён ходзіць разам з імі на рыбалку

**Рм** Раскажыце, як вы адпачываеце летам.



Правообладатель Национальный институт образования

**189.** Прачытайце. Чаму гэтыя словы нельга назваць сказам?




Расстаўце словы ў патрэбным парадку.

Прачытайце скорагаворку. Навучыцеся правільна вымаўляць яе. Растлумачце правапіс літар ***у*** і ***ў***. Запішыце скорагаворку па памяці.

**190.** Прачытайце прыказку.

**Адклад не ідзе на лад.**

Колькі слоў у сказе?
Растлумачце правапіс выдзеленых літар.
Запішыце прыказку пад дыктоўку.



**191.** Вызначце межы сказаў.

Ранкам у лесе пахнуць кветкі на розныя галасы заліваюцца птушкі

Спішыце. Пастаўце ў канцы сказаў патрэбныя знакі прыпынку.



Правообладатель Национальный институт образования

**192.** Да слоў з левага слупка падбярыце словы з правага слупка.

| | |
|---|---|
| Ружы … . | *спявае* |
| Шпакі … . | *чытае* |
| Хлопчык … . | *цвітуць* |
| Дзіця … . | *спіць* |
| Дзяўчынка … . | *прыляцелі* |

Запішыце 3 сказы на выбар.

Пра каго гаворыцца ў кожным сказе? Падкрэсліце гэтыя словы адной рыскай. Што пра іх гаворыцца? Падкрэсліце гэтыя словы дзвюма рыскамі.

Узор. *Ружы цвітуць.*

**193.** Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі.

… ловіць мышэй.
… растае́ вясной.
… лечыць людзей.

Спішыце сказы. Пра каго або пра што гаворыцца ў кожным сказе? Падкрэсліце гэтыя словы адной рыскай. Што пра іх гаворыцца? Падкрэсліце гэтыя словы дзвюма рыскамі.



Правообладатель Национальный институт образования

**Рм** **194.** З асобных слоў складзіце сказы.

Коля, клас, спяшаўся, ў.
У, хлопчык, калідоры, настаўніцу, сустрэў.
Коля, ёй, з, павітаўся.

Запішыце сказы. Падкрэсліце словы, якія абазначаюць, пра каго гаворыцца ў сказе і што гаворыцца.

Назавіце ў сказах прыназоўнікі.

Якімі словамі можна вітацца з настаўніцай? З сябрамі?

*калідо́р*

**Гаварыце правільна**

Павітацца з настаўніцай, дзякаваць бабулі, дараваць сябру.

**195.** Адкажыце на пытанні.

З кім павіталася Таня ў школе?





Правообладатель Национальный институт образования



Каму дзяўчынка хутка даравала крыўду?



Каму падзякавала Таня за смачную вячэру?



**196.** З асобных слоў складзіце сказы.

Увесну, пад, фіялка, расцвіла, ліпаю.
За, прыгожы, раскінуўся, домам, парк.

Запішыце сказы. Падкрэсліце словы, якія абазначаюць, пра што гаворыцца ў кожным сказе.

**197.** Размясціце радкі верша Ніны Галіноўскай «Хітры павучок» па парадку.

| | |
|---|---|
| 1. | На травінках павучок |
| ? | — Прылятайце, мухі, мошкі, |
| ? | выткаў тонкі гамачок. |
| ? | і пагушкайцеся трошкі. |



Правообладатель Национальный институт образования

Спішыце першы сказ. Назавіце ў ім словы, якія абазначаюць, пра каго гаворыцца ў сказе і што гаворыцца.

**198.** Расстаўце словы ў патрэбным парадку. Запішыце сказы.

Увесь, сонца, дзень, свеціць.
У, пабеглі, ручайкі, хуткія, дварах.

Падкрэсліце ў сказах словы, якія абазначаюць, пра каго або пра што гаворыцца ў сказе і што гаворыцца. У другім сказе назавіце прыназоўнік.

**199.** Прачытайце. Вызначце межы сказаў.

Надыходзяць ц..плыя дз..нькі св..ціць ласкавае сон..йка зазел..нела маладая траўка сп..ваюць галасістыя птушкі

Якія літары трэба ўставіць у словы? Растлумачце правапіс літар ***е, ё — я.***

Спішыце. Назавіце ў сказах словы, якія абазначаюць, пра каго або пра што гаворыцца ў сказе і што гаворыцца.



Правообладатель Национальный институт образования

**200.** Прачытайце прыказкі. Чаму так гавораць?

Лета збірае, а зіма праядае.
Лянок не любіць ляноты.

Колькі слоў у сказах? Спішыце сказ з чатырох слоў. Падкрэсліце ў ім словы, якія абазначаюць, пра што гаворыцца ў сказе і што гаворыцца.



**201.** З асобных слоў складзіце і запішыце сказы.

Дзеці, лес, прыйшлі, у.
Тут, ландышы, цвітуць.
Прыгожа, птушкі, спяваюць.

Падкрэсліце словы, якія абазначаюць, пра каго або пра што гаворыцца ў сказе і што гаворыцца.

**202.** Дапоўніце сказы па пытаннях і запішыце.

д з е?

Дрэвы растуць ... .

я к а я?

Смяецца ... дзяўчынка.



Правообладатель Национальный институт образования

к а л і?       я к і?

... пачаўся ... дождж.

С л о в ы  д л я  д а в е д к і: *у лесе, маленькая, раніцай, моцны.*

Падкрэсліце словы, якія абазначаюць, пра каго або пра што гаворыцца ў кожным сказе і што гаворыцца.

**Рм** **203.** Вусна дапоўніце сказы тэксту па пытаннях.



Добра сонечным днём на вуліцы. Дзяўчынкі катаюцца (н а  ч ы м?) на ... . Хлопчыкі гуляюць (у  ш т о?) у ... . Малыя гушкаюцца (н а  ч ы м?) на ... .

У другім сказе назавіце словы, якія абазначаюць, пра каго або пра што гаворыцца ў сказе і што гаворыцца.



Правообладатель Национальный институт образования

**204.** Прачытайце скорагаворку. Навучыцеся правільна вымаўляць яе.

1 2

Стройныя кедры дрыжаць на ветры. *(С. Шах.)*

Назавіце словы, якія абазначаюць, пра каго або пра што гаворыцца ў сказе і што гаворыцца.

Вусна пастаўце па стрэлках пытанні да астатніх слоў у сказе. Зрабіце гэта ў той паслядоўнасці, якую падказваюць лічбы над стрэлкамі.

**205.** Прачытайце.

1. Каля клёна расце возера. 2. Павел выразна чытае верш. 3. Цікавая канапа ляжыць на кнізе. 4. Наташа намалявала прыгожую кветку.

Назавіце сказы, у якіх дапушчаны сэнсавыя памылкі. Выправіце памылкі і запішыце сказы.

У запісаных сказах падкрэсліце словы, якія абазначаюць, пра каго або пра што гаворыцца ў сказе і што гаворыцца. Ад падкрэсленых слоў вусна пастаўце пытанні да астатніх слоў у сказах.



Правообладатель Национальный институт образования

 **206.** Прачытайце. Вызначце межы сказаў.

Прыйшла вясна школьны сад стаіць у зялёным убранні лёгкі ветрык калыша дрэвы

Спішыце. Правільна афарміце сказы на пісьме.

Падкрэсліце словы, якія абазначаюць, пра каго або пра што гаворыцца ў кожным сказе і што гаворыцца. Вусна пастаўце пытанні да астатніх слоў у сказах.

## Адкажыце на пытанні

1. Што выражае сказ?
2. З якой літары трэба пісаць першае слова ў сказе?
3. Якія знакі прыпынку ставяцца ў канцы сказа?

Пры адказе на якія пытанні ўзніклі цяжкасці? На якой старонцы вучэбнага дапаможніка можна знайсці адказы на гэтыя пытанні?



Правообладатель Национальный институт образования